**Гістарычны экскурс «Мая Радзіма - Матнявічы»**

**Пазакласнае мерапрыемства для вучняў 5–6 класаў**

**Г. І. Еўдакіменка,**

настаўнік геаграфіі і працоўнага навучання першай катэгорыі

Матнявіцкага яслі-сада – базавай школы Чачэрскага раёна

***Мэта:*** пашырыць краязнаўчыя веды вучняў пра свой населены пункт і яго ваколіцы, фарміраваць каштоўнаснае стаўленне вучняў да прыроды, сацыяльных, гаспадарчых і культурных аб’ектаў сваёй мясцовасці.

***Задачы:*** *навучальная*: пашыраць і актуалізаваць веды вучняў пра гісторыю сваёй роднай вёскі, пра аб’екты прыроды сваёй малой радзімы;

*развіваючая*: развіваць увагу і памяць, уменне супастаўляць гістарычныя факты, геаграфічныя веды і свой жыццёвы вопыт і рабіць высновы;

*выхаваўчая*: прывіваць пачуццё патрыятызму ў адносінах да сваёй малой радзімы, стымуляваць фарміраванне адказнага і беражлівага стаўлення да прыроды роднага краю.

***План мерапрыемства***

1. Уступнае слова настаўніка.

2. Анкета «Наш край».

3. Гісторыя нашага аграгарадка.

4. Прагляд відэароліка «Мая Радзіма – Матнявічы» (зняты навучэнцамі старшых класаў).

5. Матнявічы – край азёраў.

6. Ода Радзіме – кніга «Матнявіцкая зорка» (складзеная з сачыненняў і малюнкаў кожнага з навучэнцаў школы).

7. Сімвалы майго краю.

8. Заключэнне.

**Ход мерапрыемства**

**I. Уступнае слова настаўніка**

**Настаўнік.** Вельмі часта і шмат на розных уроках настаўнікі распавядаюць вам аб нашай роднай Беларусі. І амаль ніколі не распавядаюць аб нашай роднай вёсцы. Або малая радзіма заслугоўвае не меншай увагі, чым наша краіна? Сёння мы з вамі запоўнім гэты прабел і, я ўпэўненая, што вы даведаецеся нешта новае.

**II. Анкета «Наш край»**

Для таго каб вызначыць, наколькі добра вы ведаеце гісторыю нашага краю, правядзём анкетаванне «Наш край».

***Анкета «Наш край»***

1. Ці ведаеце вы, калі ўтворана вёска Матнявічы?

2. Ці ведаеце вы гісторыю паходжання назвы вёскі?

3. Ці бывалі вы ў тых месцах, якія далі назву вёсцы?

4. Ці ведаеце вы, колькі азёр, якія ўтвараюць адзіную сістэму, ёсць у ваколіцах вёскі Матнявічы?

5. Колькі іх? ___________

6. Пералічыце іх назвы: ______________________________________

_________________________________________________________________

7. На якіх з іх вы бывалі? ________________________________________

_________________________________________________________________

8. З якой мэтай вы бывалі на гэтых азёрах?

а) прагулка, б) купанне, в) рыбалка, г) адпачынак з вогнішчам, д) проста праходзіў (ла) міма, г) паказваў (ла) гасцям.

*Аналіз вынікаў анкетавання.*

**III. Гісторыя нашага аграгарадка**

*Аповед настаўніка пра гісторыю паходжання аграгарадка. Падчас аповеду навучэнцы знаёмяцца з брашурай-раскладушкай пра гісторыю вёскі.*

**Брашура.** Заснавальнікамі і першымі жыхарамі былі людзі з прозвішчамі Халаеў, Хурбатаў і Серыкаў. Больш дакладных звестак няма.

Паводле пісьмовых крыніц вёска Матнявічы вядомая з пачатку XVIII стагоддзя як паселішча ў Рэчыцкім павеце Менскага ваяводства Вялікага княства Літоўскага. Паводле інвентара 1704 года сяло Мутневічы, 2 дыму, 3 службы, ў 1726 годзе 5 дымоў 2 службы, у Отарскім войтаўстве Чачэрскага староства. Паводле вопісу 1765 года 28 дымоў.

Пасля 1-га падзелу Рэчы Паспалітай (1772 год) у складзе Расійскай імперыі. З 1832 года дзейнічала карчма. Паводле рэвізіі 1858 года ў Чачэрскай воласці Рагачоўскага павета Магілёўскай губерні. У 1875 годзе заснаваны Смалярня завод. У 1880 годзе адчынены хлебазапасны магазін. У 1886 годзе працавалі вятрак, вадзяны млын. Паводле перапісу 1897 году дзейнічалі 4 вятракі. У 1907 году дзейнічала народнае вучылішча (134 вучня). У 1909 годзе 1027 дзесяцін зямлі. Дзейнічала бібліятэка.

У 1925 году адкрыта хата-чытальня. З 8 снежня 1926 года да 29 кастрычніка 1959 года цэнтр Матнявіцкага сельсавета Чачэрскага раёна Гомельскай (да 26 ліпеня 1930 году) акругі, з 20 лютага 1938 года Гомельскай вобласці. З 1929 дзейнічала пачатковая школа. У 1929 годзе арганізаваны калгас «Молат», працавалі цагельня, вятрак, гамарня.

У час Вялікай Айчыннай вайны ў баях за вызваленне вёскі і наваколля ў лістападзе 1943 года загінулі 33 савецкіх салдаты (пахаваны ў брацкай магіле на могілках). 103 жыхары загінулі на фронце.

Паводле перапісу 1959 года – цэнтр калгасу «Юбілейны».

З 2011 года мае статус аграгарадок. Маецца яслі-сад-базавая школа, магазін, аддзяленне паштовай сувязі, ФАП, бібліятэка, сельскі клуб.

**IV. Прагляд відэароліка «Мая Радзіма - Матнявічы»**

Прагляд відэароліка «Мая Радзіма – Матнявічы», запісанага ў 2011 годзе. Пасля прагляду навучэнцы параўноўваюць сённяшнюю вёску Матнявічы і тое, якім быў населены пункт некалькі гадоў таму. Ці моцна ён змяніўся?

**V. Матнявічы – край азёраў**

Завочная экскурсія па азёрнаму ланцугу наваколляў аграгарадка Матнявічы. Выкарыстоўваюцца маляўнічыя фотаздымкі азераў, выкананыя навучэнцамі і натсаўнікамі.

Аповед настаўніка пра гісторыю стварэння азёр, узнікнення іх назваў, геаграфічная характарыстыка іх як водных аб’ектаў.

**VI. Ода Радзіме – кніга «Матнявіцкая зорка»**

Аповед пра кнігу пра в. Матнявічы, створаную навучэнцамі школы ў 2012 годзе. Знаёмства з кнігай. Зачытванне асобных твораў.

**VII. Сімвалы майго краю**

Навучэнцам прапануецца падзяліцца на групы або ўсім разам прыдумаць і намаляваць герб або сімвал аграгарадка Матнявічы з тлумачэннем кожнага элемента малюнка.

**VIII. Заключэнне**

Падвядзенне вынікаў. Паўторнае правядзенне анкеты «Наш край». У гэты раз анкета праводзіцца франтальна для таго, каб навучэнцы ацанілі, наколькі павысіліся іх веды пра малую радзіму.